# ШЛЯХІ - ДАРОГІ ЮРКІ МУХІ

Удзельнік падпольнага руху ў Заходняй Беларусі Георгій Муха-Мухноўскі (Юрка Муха) нарадзіўся ў 1905 годзе ў мястэчку Мір, у сям'і ганчара. Пасля заканчэння Мірскага вышэйшага пачатковага вучылішча хлопчык паступіў вучыцца ў Навагрудскую беларускую гімназію. У 1923 годзе пасля заканчэння 7 класаў гімназіі вырашыў ехаць вучыцца ў Прагу. Да яго далучыліся мясцовыя хлопцы Алесь Карповіч і Лявон Шавейка. Да Вільні сябры даехалі на цягніку. У Беларускім нацыянальным камітэце атрымалі накіраванне на вучобу ў Прагу, дзе ў той час вучыліся студэнты з Заходняй Беларусі. Частка моладзі імкнулася любымі шляхамі трапіць туды, каб атрымаць грунтоўную адукацыю ў адной з вышэйшых навучальных устаноў Чэхаславакіі.

По чыгунцы хлопцы дабраліся да азначанай станцыі, знайшлі праваднiка, з дапамогаю якога нелегальна перайшлі мяжу, і апынуліся ў Чэхаславакіі. Спачатку ім давялося працаваць і на працягу года наведваць курсы, каб падрыхтавацца да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Юрка Муха ўладкаваўся на працу ў рэстаран звычайным рабочым. У 1924 годзе ён здолеў паступіць на лясны факультэт політэхнічнага інстытута. У час вучобы з'яўляўся членам беларускай студэнцкай секцыі пры Беларускай грамадзе, быў членам, а потым кіраўніком “Марксісцкай групы”, удзельнічаў у стварэнні арганізацыі “Саюз студэнтаў - грамадзян БССР”, якую пазней узначаліў. Наш зямляк пастаянна супрацоўнічаў з цэнтральным органам КПЧ газетай “Чырвонае права”, у якой выступаў з артыкуламі пра сацыяльны і нацыянальны прыгнёт у Заходняй Беларусі.

У 1925 годзе ў Празе разам з іншымі беларускімі студэнтамі Юрка Муха прымаў удзел у святкаванні 400-годдзя скарынаўскага беларускага друку. Чэхаславакію неаднаразова наведвалі беларускія пісьменнікі. У 1927 годзе ў Празе адбылася сустрэча пісьменнікаў Янкі Купалы, Цішкі Гартнага, Міхася Зарэцкага і Міхася Чарота з беларускімі студэнтамі. Прымаў удзел у гэтай сустрэчы і Юрка Муха. Захаваўся фотаздымак на памяць аб цікавай падзеі.



У 1930 годзе Юрка Муха скончыў інстытут і, атрымаўшы дыплом інжынера-лесавода, вярнуўся на радзіму, але ў хуткім часе пакінуў мястэчка Мір і пераехаў у Вільню. У той час наш зямляк накіроўваў ад ЦК КПЗБ дзейнасць беларускага рабоча-сялянскага клуба “Змаганне”, быў інструктарам Таварыства беларускай школы. За агітацыйную працу ў кастрычніку 1930 года Георгій Муха быў арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў віленскую турму Лукішкі, адкуль праз тры месяцы вызвалены пад залог. У лютым 1931 года яго зноў арыштавалі, на гэты раз з турмы ён выйшаў у канцы снежня.

У 1932 годзе па рашэнні ЦК КПЗБ перабраўся ў БССР. Атрымаўшы пашпарт на імя Мухноўскага, выехаў у Сочы, дзе ўладкаваўся на працу ў лясгас. У 1933 годзе быў арыштаваны органамі НКУС і асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1956 годзе. Пра сваё жыццё і падпольную дзейнасць Г.Муха-Мухноўскі пазней расказаў у кнізе мемуараў “Шляхі-дарогі”.



Прапаную вашай увазе фотаздымак, які атрымала ад мясцовага настаўніка Міхаіла Жука, дзядзька якога, Антон Жук з вёскі Рап’ёва, што на Карэліччыне, у 1920-я гады вучыўся ў Празе разам з героем гэтага артыкула. Прозвішчы людзей напісаны на адваротным баку фота рукою Антона Жука, які застаўся жыць у Чэхаславакіі, дзе працаваў інжынерам. У Празе яшчэ засталіся масты, якія ён збудаваў. Гэты фотаздымак Антон Жук перадаў свайму пляменніку ў 1965 годзе, калі той наведаў яго ў Празе.

**Святлана КОШУР**
*Карэлічы*

**На фота:**
1 Першы рад: Міхась Чарот, Цішка Гартны, Янка Купала, Міхась Зарэцкі, Мікола Шыманка. Другі рад: Алесь Карповіч, Антон Жук, Лявон Шавейка, Міхась Каўцэвіч, Наталля Сазановіч-Орса, Пётр Орса, Юрка Муха. Прага. 1927 г.
2. Антон Жук з жонкаю Мартай у Празе.